
Фота Пятра ФАМІНА

Эксклюзіў

# ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ СТРАЧВАЕ ЖОРСТКУЮ «ПРЫВЯЗКУ» ДА ПРАПІСКІ?

**МІНІСТЭРСТВАМ архітэктуры і будаўніцтва Беларусі быў распрацаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які датычыцца змяненняў і дапаўненняў у дзеючы Ўказ № 185 ад 14 красавіка 2000 года. Карэктаванне дадзенага дакумента закранае інтарэсы маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, якія вырашаюць сваю жыллёвую праблему з выкарыстаннем ільготных крэдытаў. Аб магчымых новаўвядзеннях карэспандэнту «Звязды» расказвае *начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ.***

**— Ці будзе ў сельскай мясцовасці жорсткай «прывязка» будаўніцтва жылля да прапіскі?**

— Згодна з новаўвядзеннямі, грамадзяне атрымаюць права паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы не толькі па месцы свайго пражывання. Дакументам будзе дазваляцца ўключаць у спісы на льготнае крэдытаванне жыхароў вёсак, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання, якія маюць намер будаваць, набываць ці рэканструяваць сабе жыллё не толькі па месцы пражывання, але і на тэрыторыі ўсяго адміністрацыйнага раёна. Так, напрыклад, жыхар Ляхавіцкага раёна, незалежна ад месца свайго пражывання, можа ў любым месцы, у тым ліку і ў саміх Ляхавічах, будаваць сабе жыллё і атрымліваць пад яго льготны крэдыт.

**— Ці змогуць жыхары вёсак атрымаць ільготны крэдыт будаўніцтва жылля па-за межамі свайго сельсавета?**

— Так. Вясковец зможа пабудаваць кватэру ў райцэнтры, а жыхар райцэнтра — узвесці дом, напрыклад, у аграгарадку. Дадзенае новаўвядзенне істотна пашырае зону магчымага будаўніцтва, якое будзе ажыццяўляцца паводле прынцыпу мэтазгоднасці ўжо без бюракратычных перашкод.

**— Сярод пэўнай часткі жыхароў буйных гарадоў адзначаецца тэндэнцыя па пошуку жылля ў сельскай мясцовасці...**

— Улічваючы гэты напрамак, спецыялісты галіны ўнеслі ў праект Указа такую норму, згодна з якой жыхары гарадоў абласнога падпарадкавання і Мінска могуць уключацца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў па лініі будаўніцтва ці набыцця кватэр і (або) жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах. Да гэтага часу было даволі складана будавацца, напрыклад, жыхарам Мінска ў Мінскім ці іншым раёне Беларусі. Цяпер жыхары сталіцы, абласных цэнтраў краіны маюць магчымасць будаваць сабе жыллё ў межах сваёй вобласці і атрымліваць ільготны крэдыт, калі на яго атрыманне ў грамадзяніна ёсць адпаведнае права.

**— Шмат пытанняў узнікае пра службовыя чэргі. Яны раней не мелі паўнаважкага статусу.**

— Дадзеным праектам адрэгулявана пытанне аб уключэнні ў спісы на льготнае крэдытаванне грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы. Грамадзянін можа не стаяць на жыллёвым уліку ў выканкаме, а толькі па месцы працы. У гэтым выпадку факт знаходжання работніка ў службовай чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў дазволіць будавацца ў сваім раёне ў сельскай мясцовасці або ў прыгарадах буйных гарадоў — абласных цэнтраў і Мінска.

**— Але ці не адбудзецца тое, што, напрыклад, жыхар сталіцы пабудуе сабе жыллё з выкарыстаннем дзяржаўнай дапамогі ў сельскай мясцовасці і разам з тым будзе заставацца «чаргавіком» у Мінску?**

— Такі фокус сёння ўжо немагчымы. Уключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне грамадзян, якія маюць жаданне палепшыць свае жыллёвыя ўмовы не па месцы пражывання, будзе ажыццяўляцца мясцовымі выканкамамі па месцы пастаноўкі на «жыллёвы» ўлік толькі пры ўмове добраахвотнага волевыяўлення на зняцце з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства. Мы лічым, што цяпер улік чаргавікоў будзе весціся больш дасканала. Больш за тое, вызначэнне памераў плошчы льготнага крэдытавання будзе весціся з улікам агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў іх ва ўласнасці (як у крэдытаатрымальніка, так і ў членаў яго сям'і) і па месцы жыхарства, і па месцы будаўніцтва. Да гэтага нарматыўная практыка ўлічвала толькі жыллё па месцы будаўніцтва. Напрыклад, жыхар Мінска мае маленькую кватэру ў сталіцы і яшчэ кватэру ў Брэсце. Пачынае будавацца з дапамогай льготных крэдытаў. Па існуючых нормах, сёння памер плошчы, якая крэдытуецца, падлічваецца толькі з улікам мінскай кватэры, калі будаўніцтва ажыццяўляецца ў сталіцы. Пасля таго як запрацуе распрацаваны намі праект Указа кіраўніка дзяржавы, то пры вызначэнні плошчы жылля, якая падпадае пад ільготнае крэдытаванне, будзе ўлічвацца і брэсцкая, і мінская жыллёвая нерухомасць. Гэта будзе адным з крокаў да пераходу на сістэму заліку жыллёвай плошчы пры выдзяленні льготных крэдытаў увогуле на ўсёй тэрыторыі краіны.

**— Існавалі выпадкі, калі чалавек па розных падставах мог будаваць сабе жыллё як чаргавік два ці тры разы, і кожны раз карыстаўся льготнымі крэдытамі...**

— Сёння праект Указа прадугледжвае той факт, што атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля чалавек можа толькі адзін раз. Нават калі ў чалавека змяніліся нейкія сямейныя ці іншыя абставіны (развёўся, ажаніўся), то зноў атрымаць ільготны крэдыт для будаўніцтва жылля яму будзе ўжо немагчыма.

**— А калі сям'я атрымлівае статус шматдзетнай?**

— Так, толькі шматдзетныя сем'і захоўваюць права на атрыманне льготных крэдытаў для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў паўторна.

**— Сем'і, якія пабудавалі жыллё з дапамогай ільготных крэдытаў, часам распадаюцца. Як дзяліць кватэру, каму плаціць па крэдыце? — гэтыя і іншыя пытанні былі пакуль амаль невырашальнымі.**

— Праектам уводзіцца норма па выплаце запазычанасці па льготным крэдыце і працэнтаў па ім, калі сям'я распадаецца. Цяжкасцяў не ўзнікае, калі жыллё будавалі муж з жонкай. А калі ў складзе сям'і былі дзеці, пляменнікі, бабулі, дзядулі, сёстры, браты і г.д. У гэтых выпадках дазваляецца ў судовым парадку вызначаць долі выплатаў крэдытаў, ці долі кватэры кожнага члена сям'і ў выпадку, калі крэдыты былі выплачаны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Рэзананс

# «Спачатку бульдозер — потым сход»

Пад гэтай назвай у «Звяздзе» 14 мая г. г. пад рубрыкай «Канфліктная сітуацыя» была змешчана публікацыя па зваротах у рэдакцыю жыхароў дамоў № 4, 6, 10, 30, 36 па вуліцы Максіма Танка ў Мінску, якія выступалі супраць узвядзення побач кампаніяй «Ітэра» першых у гісторыі сталіцы хмарачосаў (адзін з іх вышынёй 217 метраў). Гэта будзе шматфункцыянальны бізнэс-цэнтр класа «А» (вышэйшай катэгорыі) з дзвюх вежаў: 54 і 43 паверхі адпаведна. Такое суседства моцна насцярожыла жыхароў суседніх дамоў. Людзей вельмі абурыла тое, што гарадскія ўлады далі згоду на гэтую «будоўлю стагоддзя» без уліку іх меркавання. І пачалася кампанія супраціўлення: у розныя інстанцыі пайшлі скаргі.

У сітуацыі разбіраўся наш карэспандэнт. У выніку быў надрукаваны вышэйназваны артыкул. Яго мы накіравалі на рэагаванне ў Мінгарвыканкам. Шчыра кажучы, яго рэакцыя здзівіла вытанчаным бюракратычным падыходам аўтараў гэтай паперы да зместу праблемнага артыкула. Вось адказ Мінгарвыканкама ў поўным аб'ёме.

**Аб разглядзе матэрыялаў справы**

*Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт разгледзеў артыкул «Спачатку бульдозер — потым сход», апублікаваны ў газеце «Звязда» 14.05.2008, і паведамляе наступнае.*

*На падставе рашэння Мінгарвыканкама ад 30.09.2004 № 2024 зацверджаны акт выбару зямельнага ўчастка ад 25.03.2004 СААТ «Ітэрабелбуд» для будаўніцтва бізнэс-цэнтра па вул. М. Танка і дазволена правядзенне праектна-пошукавых работ.*

*Цяпер, згодна з рашэннем Мінгарвыканкама ад 27.09.2007 № 2231, СААТ «Ітэрабелбуд» праводзяцца падрыхтоўчыя работы (вынас інжынерных сетак) па будаўніцтве аб'екта «Бізнэс-цэнтр па вул. М. Танка» і дазволе Інспекцыі Дэпартамента Дзяржбуднагляду па г. Мінску ад 24.012008 № 2-209К-003/08.*

*24.03.2008 была арганізавана сустрэча жыхароў шматпавярховых жылых дамоў па вул. М. Танка з прадстаўнікамі адміністрацыі Цэнтральнага раёна, СААТ «Ітэрабелбуд», камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, упраўлення ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама для азнаямлення з праектам будаўніцтва шматфункцыянальнага бізнэс-цэнтра па вул. М. Танка і разгляду ўсіх паднятых пытанняў.*

*Па найбольш хвалюючых тэмах жыхарам гэтага квартала неаднаразова давалася пісьмовая інфармацыя па будаўніцтве згаданага аб'екта. У аснову горадабудаўнічай канцэпцыі эскізнага вырашэння шматфункцыянальнага бізнэс-цэнтра закладзена ідэя стварэння штучнага ландшафту (другой зямлі), пад якім трохузроўневы комплекс з уваходнымі групамі двух высотных корпусаў цэнтра, які ўключае ў сябе, нароўні з офіснымі памяшканнямі, Апарт-гатэль, гасцініцу вышэйшай катэгорыі з неабходным наборам дапаможных, грамадскіх і спартыўна-забаўляльных памяшканняў.*

*Эскізнае вырашэнне не змяняе існуючую вулічна-дарожную і пешаходныя сувязі паміж вул. Кальварыйскай і станцыяй метро «Фрунзенская» і вул. М. Танка. На платформе цэнтра для пешаходаў будзе арганізаваны крыты скразны праход ад метро да вул. М. Танка з закладкай газона, пасадкай кустоў і дрэў.*

*У эскізным вырашэнні закладзена захаванне існуючага сквера па вул. М. Танка і наданне яму новага статусу з магчымым правядзеннем масавых грамадскіх мерапрыемстваў з максімальным абмежаваннем высечкі зялёных насаджэнняў. Пасля заканчэння будаўніцтва плануецца зрабіць газоны і кветнікі.*

*Двухпавярховы паркінг на 110 машына-месцаў прадугледжаны для стаянкі аўтамабіляў наведвальнікаў бізнэс-цэнтра, гасцініцы, гандлёва-забаўляльнага комплексу і жылога дома, а таксама разгрузкі прылеглых дваровых тэрыторый.*

*Для паляпшэння транспартнай сітуацыі гэтага раёна прадугледжваюцца дадатковыя транспартныя развязкі і будаўніцтва трэцяй веткі метро з перасадкай на станцыі «Фрунзенская».*

*Высокія вежы рознай павярховасці зробяць багацейшым сілуэт цэнтральнай часткі горада і змогуць завяршыць горадабудаўнічую перспектыву шэрагу вуліц — Кальварыйскай, Ціміразева, К. Цэткін. Размяшчэнне згаданага комплексу адказвае сучасным тэндэнцыям развіцця горадабудаўнічага асяроддзя сталічнага цэнтра.*

*Намеснік старшыні
Н.А. Ладуцька.*

Пералічваецца і пераказваецца гісторыя прыняцця рашэння аб будаўніцтве бізнэс-цэнтра... Але не аб тым ішла размова ў публікацыі. Рэдакцыя ў першую чаргу звярнула ўвагу чытачоў і Мінгарвыканкама на няўменне мясцовай улады працаваць з насельніцтвам, на заганную тэндэнцыю прымаць сур'ёзныя рашэнні аб будаўніцтве важных аб'ектаў келейна, без уліку меркавання мінчан, служыць якім верай і праўдай заклікана гарадское чыноўніцтва. Можа таму апошнім часам узнікае вельмі шмат канфліктаў у Мінску вакол узвядзення новых аб'ектаў ва ўжо даўно сфарміраваных масівах забудовы. А нам пішуць аб нейкіх прынятых захадах, якія на самай справе замест разумення пазіцыі гарвыканкама выклікалі абурэнне мінчан. Аб гэтым сведчаць звароты ў рэдакцыю... Чытачы чакалі даведацца, што гарвыканкам мяркуе зрабіць па выпраўленні гэтых недахопаў.

У нас улада нярэдка нагадвае, што не ўсё так дрэнна было пры СССР. І сапраўды, раней, у прыватнасці, існавала жорсткая ўстаноўка: партыйным камітэтам і выканкамам своечасова і прадметна рэагаваць на крытычныя і праблемныя публікацыі газет. Спробы даць фармальны, не па сутнасці выкладзенага ў публікацыі адказ рэдакцыі ўспрымалі ў штыкі, друкавалі гэткія рэагаванні пад рубрыкай «адпісак не прымаем». Гэтыя правілы ўзаемаадносінаў з дзяржаўным друкам захаваліся і сёння...

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

Прамая лінія

# БЕЗ ЦЫРОЗУ І ГАСТРЫТУ, ЯЗВЫ І ПАНКРЭАТЫТУ

***(Працяг. Пачатак у нумары за 5 ліпеня.)***

**З найноўшымі дасягненнямі дыягностыкі і лячэння хваробаў гастраэнтэралагічнага профілю чытачоў «Звязды» знаёміць урач-гастраэнтэролаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ.**

***☎ — Галіна, званю з Ельска. Скажыце, ці праўда, што прыступ язвы можна зняць содай?***

— Не, гэта памылка. Сода не аказвае ніякага лячэбнага эфекту. Язву трэба лячыць. Абавязкова неабходна звярнуцца да ўрача.

***☎ — Смаргонь, Яўген Станіслававіч. Мне 50 гадоў. Пастаўлены дыягназ — хранічны спастычны каліт, дыскінезія тоўстай кішкі па гіпакінетычным тыпе, хранічны гастрыт з участкамі атрафіі слізістай, дуадэнагастральны рэфлюкс, недастатковасць баугіневай заслонкі, гепатоз печані. Часта адчуваю боль у нізе жывата злева. Акрамя таго, на галаве — балячкі. Няўжо гэта звязана са станам страўнікава-кішачнага тракта? І яшчэ. Прымаю амепразол і панкрэатын. Што яшчэ з прэпаратаў вы парэкамендуеце?***

— Давайце разбірацца па парадку. Хранічны спастычны каліт плюс дыскінезія тоўстай кішкі па гіпакінетычным тыпе. Гэта суправаджаецца запорамі. У такім выпадку ў харчаванне трэба ўключаць інгрэдыенты, якія ўтрымліваюць грубавалаконную ежу. Напрыклад, добра есці салату з радыскі, буракі, алей, вотруб'е — яны аказваюць паслабляльнае дзеянне. Можна прыгатаваць салату з вараных буракоў, дадаць яблык і заправіць алеем... Хранічны гастрыт з'яўляецца ўзроставай паталогіяй і асабліва небяспечным не з'яўляецца. Пры дуадэнагастральным рэфлюксе адбываецца закід змесціва з 12-перснай кішкі ў страўнік, што пагражае эрозіяй і нават язвай. Такая паталогія патрабуе антырэфлюкснай тэрапіі, якая нармалізуе перыстальтыку ў адным напрамку. Прымаць трэба антырэфлюксныя прэпараты, напрыклад, матыліум. Пры недастатковасці баугіневай заслонкі зноў-такі прымаюцца антырэфлюксныя прэпараты. Гепатоз печані, хутчэй за ўсё, абумоўлены тлушчавым перараджэннем органа. Трэба зніжаць вагу, нармалізаваць масу цела. Для гэтага неабходна адрэгуляваць харчаванне, менш ужываць высокакаларыйную ежу, жывёльны тлушч. Нельга прымаць алкаголь. Болі ў нізе жывата звязаны са спастычным калітам, які трэба лячыць. А вось болькі на галаве — наўрад ці вынік захворванняў страўнікава-кішачнага тракта. Раю зрабіць аналіз крыві на глюкозу.

***☎ — З Мінска звоніць Анатоль Аляксеевіч. Скажыце, калі ласка, як трэба харчавацца чалавеку, у якога на тры чвэрці выдалены страўнік. Мяне цікавіць, якую колькасць ежы трэба прымаць за адзін раз, колькасць прыёмаў на працягу дня, колькасць інтэрвалаў паміж прыёмамі ежы? Як гэта рабіць на працягу першага года пасля аперацыі?***

— Харчаванне павінна быць дробнымі порцыямі, 5—6 разоў на дзень. Перанасычэнне страўніка недапушчальнае. Ежа павінна быць нераздражняльная, абвалакальная. Рэкамендуюцца кашы, супы.

***☎ — Жлобін, Алена. У красавіку ў мяне быў другі прыступ жоўцекамянёвай хваробы. Ці значыць гэта, што абавязкова трэба рабіць аперацыю? Справа ў тым, што ў мяне праблемы з анестэзіяй. Можа, мне дапамогуць гамеапатычныя сродкі?***

— Аперацыя ўсё ж неабходная. І тактыку яе правядзення вызначаць спецыялісты. У іншым выпадку ў паталогію ўцягваецца печань, падстраўнікавая залоза. Вельмі небяспечным ускладненнем з'яўляецца разрыў жоўцевага пухіра, што можа быць пагрозай для жыцця.

***☎ — Са Слоніма турбуе Іван Паўлавіч. Раніцай у мяне бываюць цягнучыя болі ў страўніку, праз 2—3 гадзіны пасля ежы з'яўляецца пякотка і кіслая адрыжка. Што гэта можа быць і што з гэтым рабіць?***

— У вас, хутчэй за ўсё, гастраэзафагеяльная рэфлюксная хвароба, якая ўсё ж патрабуе пацвярджэння абследаваннем. У яго ўваходзіць фібрагастраэндаскапія і абследаванне страўнікавага кіслотнага ўзроўню. Пасля абследавання і пацвярджэння дыягназу вам прызначаць адпаведнае лячэнне.

**«Прамую лінію» правялі
Святлана БАРЫСЕНКА,
Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***

## БРАКАНЬЕРАМ ПАЛЁГКІ НЕ БУДЗЕ

Двое непрацуючых грамадзян з Гомеля і з вёскі Занарач Мядзельскага раёна на возеры Нарач паспрабавалі незаконным шляхам — з дапамогай восцяў і акваланга — здабыць вугра. Паспелі «ўпаляваць» 15 асобінаў, пакуль іх не затрымалі работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Акваланг, восці і рыба канфіскаваны. Урон склаў больш за 2,6 млн рублёў. Ці быць у дачыненні да браканьераў крымінальнай справе, вырашаюць зараз у Мядзельскім РАУС.

А на рацэ Добрыч Кармянскага раёна жывёлавод КСУП «Багдановічы» і непрацуючы грамадзянін здабывалі рыбу з дапамогай сетак. Паспелі злавіць двух шчупакоў і 74 вузкапалых ракаў. Лоўля апошніх цяпер забаронена. Урон браканьеры нанеслі на суму амаль у 4 мільёны рублёў. Кармянскі РАУС разглядае пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Кансультацыя натарыуса

# УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ СПЫТАЦЬ ПРА НАТАРЫЯТ

**Сёння на пытанні чытачоў адказвае намеснік загадчыка першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Вераніка ЛІТВІНКА**

## І адзін экзэмпляр завяшчання дзейнічае

**Падчас сямейнай сваркі муж знішчыў (разарваў на некалькі кавалкаў) завяшчанне на дом на імя сына. Яно было афіцыйна засведчана натарыусам. Пасля мы зноў прыйшлі да сямейнай згоды і вырашылі пакінуць завяшчанне ў ранейшым выглядзе — як склалі яго раней. Як можна аднавіць знішчаную паперу, колькі гэта будзе каштаваць? Мы звычайныя пенсіянеры, маем прыватны дом.**

— Калі падчас сямейнай сваркі быў знішчаны толькі адзін экзэмпляр завяшчання, яно не прызнаецца адмененым і будзе дзейнічаць на момант адкрыцця спадчыны, — тлумачыць Вераніка Анатольеўна. — Згодна з артыкулам 1049 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, завяшчанне можа быць адменена толькі адным з двух спосабаў: або шляхам здзяйснення новага завяшчання, або шляхам знішчэння ўсіх экзэмпляраў завяшчання, уключаючы той, які захоўваецца ў справах натарыяльнай канторы. Атрымаць дублікат завяшчання, адзін экзэмпляр якога страчаны (разарваны, згублены, скрадзены і г.д.) пры жыцці завяшчальніка мае права толькі завяшчальнік, а пасля яго смерці асоба, на карысць якой складзена завяшчанне, або муж (жонка), бацькі, дзеці, унукі, дзед, бабка, родныя браты і сёстры завяшчальніка.

## Атрыманне ў спадчыну і па завяшчанні, і па закону

**Завяшчанне на дом бацькі склалі на аднаго з дзяцей. Ці можа іншае дзіця пасля атрымання першым права на спадчыну таксама прэтэндаваць на маёмасць? Справу, напэўна, давядзецца вырашаць у судовым парадку? На чым баку звычайна ў такой сітуацыі бывае суд? Дзеці — родныя паміж сабой, працаздольныя, усе на гэты час пражываюць асобна ад бацькоў.**

— У адпаведнасці з Грамадзянскім Кодэксам Рэспублікі Беларусь, атрыманне ў спадчыну ажыццяўляецца па завяшчанні і па закону. Атрыманне ў спадчыну па закону мае месца тады, калі завяшчанне адсутнічае, або вызначае лёс не ўсёй спадчыны, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь. Да аднаго з такіх выпадкаў адносіцца прыняцце спадчын так званымі «абавязковымі» спадчыннікамі. Абавязковымі называюцца спадчыннікі, якія, у адпаведнасці з артыкулам 1064 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, атрымліваюць у спадчыну незалежна ад зместу завяшчання не менш за палову долі, якая належала б ім пры атрыманні ў спадчыну па закону. Да іх адносяцца: няпоўнагадовыя або непрацаздольныя дзеці спадчынадаўцы, а таксама непрацаздольныя муж (жонка) і бацькі. Да непрацаздольных адносяцца жанчыны, якія дасягнулі 55-гадовага ўзросту, мужчыны — 60-гадовага, інваліды I, II, III груп незалежна ад таго, прызначана ім пенсія па ўзросце ці інваліднасці. Да няпоўнагадовых адносяцца асобы, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

Акрамя таго, атрыманне ў спадчыну будзе адбывацца па закону, калі завяшчанне будзе прызнана несапраўдным судом па іску асобы, правы ці інтарэсы якога парушаны гэтым завяшчаннем. Завяшчанне прызнаецца несапраўдным у строга вызначаных выпадках: або пры парушэнні правілаў пра форму завяшчання, або пры парушэнні іншых палажэнняў Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія цягнуць несапраўднасць завяшчання ці несапраўднасць здзелак.

## Прыватныя натарыусы выдаюць не ўсе дакументы

**Да якога натарыуса — у дзяржканторы ці прыватнага — больш надзейна звяртацца? Ці ёсць розніца ў аплаце паслуг?**

— На сучасным этапе прыватныя натарыусы не выдаюць пасведчанні аб праве на спадчыну і пасведчанні аб праве ўласнасці мужу (жонцы), якія жывуць. Астатнія натарыяльныя дзеянні яны здзяйсняюць нароўні з дзяржаўнымі натарыусамі, — гаворыць Вераніка Літвінка. — Законам Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» ўстаноўлена, што пры здзяйсненні натарыяльных дзеянняў дзяржаўныя і прыватныя натарыусы маюць роўныя правы і нясуць аднолькавыя абавязкі, а аформленыя імі дакументы маюць аднолькавую юрыдычную сілу. За здзяйсненне натарыяльных дзеянняў і прыватныя, і дзяржаўныя натарыусы бяруць дзяржаўную пошліну па стаўках і ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай пошліне». Прыватныя натарыусы за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў і за аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару, звязаных са здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў, бяруць з грамадзян і юрыдычных асобаў таксама натарыяльны тарыф. Стаўкі натарыяльнага тарыфу ўстаноўлены пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 ліпеня 1998 года № 1206 (са змяненнямі і дапаўненнямі ад 15 ліпеня 2002 года і ад 26 лістапада 2004 года) у працэнтных адносінах ад базавай велічыні. Дзяржаўныя натарыусы за аказанне дадатковых платных паслуг прававога і тэхнічнага характару, звязаных са здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў, бяруць з грамадзян і юрыдычных асобаў аплату згодна з тарыфамі. Дзеючы прэйскурант зацверджаны пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 5 чэрвеня 2008 года № 117. Зыходзячы з указаных нарматыўных актаў, дакументы, аформленыя дзяржаўнымі натарыусамі, абыходзяцца танней.

## Па пашпарт — у аддзел па грамадзянстве і міграцыі

**Збіраюся ўзяць шлюб з грамадзянінам Германіі. Афарміць адносіны мы плануем у Беларусі, але потым, як сумесна было вырашана, я паеду на пастаяннае месца жыхарства на радзіму будучага мужа. Планую там з цягам часу або пайсці на вучобу, або на працу. Як я разумею, мне патрэбна будзе афарміць пэўныя дакументы для пражывання ў Германіі. Падкажыце, якія канкрэтна? Што для гэтага і куды трэба падаць?**

— Для атрымання пашпарта для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь чытачцы патрэбна звярнуцца ў аддзел па грамадзянстве і міграцыі таго раёна, дзе яна зарэгістравана па месцы жыхарства. Афармленне гэтага дакумента адбываецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 2006 года № 152 «Аб зацвярджэнні пераліку адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян».

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «СПАТЫКНУЎСЯ» ГАЛОЎНЫ АГРАНОМ

**Як мяркуецца, кругленькую суму пацягнуў са сваёй гаспадаркі ў Лунінецкім раёне спецыяліст, які працаваў тут на адказнай пасадзе.**

Размова ідзе аб 34-гадовым галоўным аграноме аднаго з сельгасвытворчых кааператываў, які падазраецца ў тым, што са студзеня мінулага года па чэрвень гэтага прысвоіў 510 літраў дызпаліва, 222 літры і 13,5 кілаграма ядахімікатаў — усяго на суму 21 мільён рублёў.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

## ЗДАВАЎ КРОЎ І ПІЎ

**У гарадскім пасёлку Янавічы Віцебскага раёна ў старым доме, што згарэў, знайшлі труп 51—гадовага мужчыны.**

Дарэчы, год таму ён ужо цярпеў ад пажару — згарэў ягоны дом таксама ў Янавічах. А той, дзе ён жыў да смерці, купілі яму суседзі — пашкадавалі чалавека з цяжкім лёсам. Скардзіўся, што сваякі ў абласным цэнтры падманулі, перасялілі ў правінцыю. Загінулы падпрацоўваў пастухом, пры гэтым асноўная крыніца яго даходу была здача крыві. Гэты донар траціў зароблены такім чынам грошы на спіртное. Кажуць, незадоўга да трагедыі напіўся так, што нікога не пазнаваў. Што менавіта стала прычынай яго смерці, цяпер высвятляецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АХОЎНІК ПАКВАПІЎСЯ НА ФАРЭЛЬ

**На адной з рэк Навагрудскага раёна дзяржінспектарамі быў затрыманы намеснік начальніка аддзела аховы ЗАТ «Белэлектронкамплект», які на спінінг злавіў 10 асобінаў ручаёвай фарэлі.**

Апошняя, між іншым, унесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. На месца выклікалася следча-аператыўная група Навагрудскага РАУС, куды накіраваны матэрыялы для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У беларускі музей з італьянскім тэмпераментам

Шэсць гадоў таму італьянскі мастак Міма дэ Феліча ўразіў мінчан сонечнымі краявідамі адрыятычнага ўзбярэжжа і вобразамі людзей, якія там жывуць. Сёлета ён зноў вяртаецца ў Беларусь з выставай, ды не адзін, а разам са сваімі сябрамі, італьянскімі мастакамі Чэзарэ Касонэ, Умберта Калапінта і Марыяй Канцэрва. Усе яны — землякі Міма дэ Феліча, паходзяць з паўднёвага рэгіёна Апенінскага паўвострава пад назвай Пулія. З пачатку ліпеня ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі будзе працаваць агульная выстава чацвярых італьянцаў «Адносіны ў мастацтве». Адносіны як у сучасным мастацтве, так і да яго ў гледачоў складваюцца вельмі неадназначна. І ніколі не ведаеш, дзе цябе больш зразумеюць — на радзіме ці за яе межамі. Усе ўдзельнікі выставы — прадстаўнікі сучаснага фігуратыўнага італьянскага мастацтва эксперыментуюць з колерамі. А праз іх кожны здолее адчуць італьянскі тэмперамент і любоў да сваёй працы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 20 (588)
аддзел рэкламы
☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

■ Дом памерам 6х8 пад знос у в. Галынь Навагрудскага раёна.
Тэл. 714 79, 253 35 69.

■ Дом, 8 км ад Мінска па Гродзенскай дарозе, можна пад знос, нядорага.
Тэл. 8 029 618 80 32.

■ Кватэра 4-пакаёвая ў г. Шчучыне, або абмяняю.
Тэл. 8 01514 29 546.

■ Зруб 6х8 пад дахам, з вокнамі і дзвярамі, маюцца будматэрыялы.
Тэл. 8 01646 39 950, сот. 390 38 07.

■ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Мінску.
Тэл. 233 33 40, сот. 325 67 07.

■ Кватэра 3-пакаёвая кааператыўная, гараж, тэлефон, у райцэнтры Гарадок.
Тэл. 8 0212 48 08 09.

■ Частка дома, які будуецца ў Брэсцкім раёне, з майстэрняй.
Тэл. 8 029 801 69 81.

■ «Аўдзі А4» 1995 г.в., 1,8, бензін.
Тэл. 8 029 651 517.

■ Конь, узрост 10 гадоў.
Тэл. 8 01718 47 312.

■ Прычэп УАЗаўскі.
Тэл. 8 029 805 17 56, 8 01632 39 111.

■ Ружжо «ІЖ» 16 калібру (Віцебская вобл.).
Тэл. 8 021 532 33 70.

***КУПЛЮ***

■ Старадаўнія манеты, узнагароды, дорага.
Тэл. 8 029 553 43 66.

■ Матаблок.
Тэл. 8 033 665 87 69.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**
**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

**Тэлефон для даведак 287 17 79.**

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

**У суд Лідскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Сімачэнка Марыны Іванаўны,** 9 студзеня 1968 года нараджэння, ураджэнкі г. Луганск, Украіна, апошняе месца жыхарства: г. Ліда, вул. Фамічова, 12—2. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра М.І. Сімачэнка, паведаміць іх суду Лідскага раёна Гродзенскай вобласці па тэл. 25 943, 24 441 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Працяг дыскусіі

# Ганарар за падручнік не павінен залежаць ад колькасці яго старонак

З цікаўнасцю назіраю за дыскусіяй, што разгарнулася на старонках «Звязды», і хачу таксама ў яе ўключыцца. Мяркую, што палемізаваць наконт тэрмінаў сярэдняй адукацыі сэнсу няма, бо рашэнне ўжо прынята — адназначна адзінаццацігодка. Аднак падзяляю меркаванне, што рэзкі скачок з дванаццацігодкі ў адзінаццацігодку — непажаданы, бо ў гэтым выпадку пацерпяць інтарэсы даволі вялікай колькасці маладых людзей. На мой погляд практыка, без асаблівых узрушэнняў вяртанне да адзінаццацігадовай адукацыі можна было б пачаць з восьмага класа.

А вось думка, што школа была палігонам для выпрабавання новых тэхналогій, даволі спрэчная. Да плюсоў рэфармавання можна аднесці большую свабоду, якую атрымаў настаўнік на ўроку. Сапраўды, у ходзе рэформы і настаўніку, і вучню даводзілася разам асвойваць новыя вучэбныя дапаможнікі. А аўтары падручнікаў і дапаможнікаў значную ўвагу пры стварэнні надавалі выдавецкім аркушам, бо ад аб'ёму залежаў іх ганарар. Каб у будучыні зноў не наступіць на тыя ж граблі, трэба вызначыць ганарар за падручнік, а не за яго аб'ём. Напрыклад, гістарычныя звесткі аб адкрыццях і вынаходніцтвах можна было б выдаць асобнай кніжкай, з разліку 5 экзэмпляраў — на сельскую і 10 экзэмпляраў — на гарадскую школы. У выніку падручнік зменшыў бы свой аб'ём, а яго змест стаў бы больш даступным для вучня.

Чамусьці многія выступоўцы абрынуліся на дзесяцібальную сістэму адзнак. Сістэма адзнак сама па сабе не аказвае ўплыву на якасць ведаў і ўжо дакладна не пагаршае іх. Перавагі дзесяцібальнай сістэмы над пяцібальнай заключаюцца ў тым, што яна дазваляе настаўніку, які штодзень працуе з вучнямі, не толькі ацэньваць іх веды, але і прымяняць яе ў якасці стымулу для слабейшых вучняў. Напрыклад, можна пахваліць вучня не толькі словамі, але і падтрымаць сваю пахвалу адзнакай на адзін бал вышэйшай (напрыклад, замест «тройкі» паставіць «чацвёрку»). А паспрабуйце гэта зрабіць карыстаючыся пяцібальнай сістэмай!

З іншага боку, пераход ад пяцібальнай сістэмы з яе адмоўнымі адзнакамі да дзесяцібальнай «дапамог» ліквідаваць другагодніцтва: любая адзнака цяпер дазваляе вучню быць пераведзеным у наступны клас. Ведаеш — не ведаеш, вучыўся — не вучыўся, але цябе ўсё роўна абавязкова перавядуць. Хоць адзнакі вучня сведчаць толькі аб тым, што ён наведваў школу, а яго як той баласт перацягвалі з класа ў клас. Горшага ўдару па паспяховасці і прыдумаць было нельга. Між іншым, жыццё ўносіць свае карэктывы, і, напрыклад, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах адзнакі «адзін» і «два» не дазваляюць працягваць вучобу. Напэўна, і ў школе дзве першыя адзнакі трэба лічыць адмоўнымі, як таго вымагае жыццё. Мяркую, што лічбы можна «агучыць» наступным чынам: «адзін» — вельмі дрэнна, «два» — дрэнна, «тры» — слаба, «чатыры» — пасрэдна, «пяць» — здавальняюча, «шэсць» — добра, «сем» — вельмі добра, «восем» — трывала, «дзевяць» — адметна і «дзесяць» — выдатна. Ці ўсе адзнакі будуць выкарыстаны настаўнікам? Мяркую, што ў ацэнках вусных адказаў будуць выкарыстаны не менш як 90 працэнтаў гэтых адзнак, а ў пісьмовых работах — і ўсе 100 працэнтаў.

Пэўны час таму па нейкіх прычынах са школьнай праграмы было выключана чарчэнне. З якой мэтай, каб ліквідаваць нагрузку? Ці гэта была проста звычайная безадказнасць? Але хто падумаў наперад, што цэлае пакаленне будзе пазбаўлена графічнай граматнасці. Між іншым, чарчэнне патрабуецца не толькі інжынеру ці тэхнолагу, але і прарабу, і рабочаму на будоўлі...

Тэсціраванне, як метад адбору абітурыентаў, на маю думку, сябе апраўдаў. Але заданні не павінны выходзіць за рамкі школьнай праграмы. Прывяду прыклад па фізіцы: «Знайдзіце радыус крывізны траекторыі цела, кінутага гарызантальна з хуткасцю 10 м/с праз 3 секунды палёту». Задача рашаецца, але не вучнем сярэдняй школы.

Асаблівую ўвагу хацелася б удзяліць страце залатым і сярэбраным медалямі іх ранейшага статусу. Як можна такую працяглую і інтэнсіўную работу вучня ацэньваць «памятным упрыгажэннем»? Матыў — медалі ліпавыя! Не магу, паважаныя, з вамі пагадзіцца...

Сапраўды, у адукацыі, як і ў медыцыне ўсё важна, усё з'яўляецца галоўным. Дробязяў няма. Таму вельмі важна не дапускаць непрадуманых і няўзважаных рашэнняў...

**Яўген Цімафеевіч ВАСІЛЬЕЎ,
настаўнік вышэйшай катэгорыі,**
*Асіповіцкі раён.*

